УДК 72.05:296.735(476.6)

# АРХІТЭКТУРНЫЯ ПОМНІКІ АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА КАСЦЁЛ УЗВЫШЭННЯ СВЯТОГА КРЫЖА Ў ВЁСЦЫ БЫСТРЫЦА

*М.К. ШАЎЛІС*
*(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)*

*Даследаванне прысвчана архітэктурным помнікам Астравецкага раёна, сярод якіх касцёл узвышэння Святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца. Разглядаецца адметны архітэктурна-мастацкі стыль, які атрымаў у мастацтвазнаўстве назву «віленскае барока».*

Быстрыца – гэта адно з самых старажытных паселішчаў Астравеччыны. Мястэчка ўпершыню ўзгадана ў летапісах у 1390 годзе, калі кароль Ягайла заснаваў тут касцёл і кляштар канонікаў рэгулярных святога Аўгустына. У 1407 годзе Быстрыца – уласнасць караля Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) Вітаўта і цэнтр Быстрыцкай воласці. У Быстрыцкім кляштары склаў свае першыя манаскія клятвы Міхал Гедройць, будучы благаславёны, у якога і сёння просяць заступніцтва тысячы людзей. Цела брата Міхала спачывае ў адным з касцёлаў Кракава. А звонку пабудавана прысвечаная яму каплічка.

У 1526 годзе Быстрыца – уласнасць караля Жыгімонта І, але валодае ёй віленскі ваявода Альбрэхт Марцінавіч Гаштольд (аўтар Першага Статута ВКЛ, яму, дарэчы, належаў і Астравец).

У кожным горадзе ці мястэчку, размешчаным на сплаўнай рацэ, была тады мытня, дзе спаганялася мыта за правоз тавараў з купцоў, якія праплывалі міма. Аднак тавар, які правозіўся для патрэбаў караля, не абкладаўся мытам. Збор мыта з гандляроў быў уведзены ў Быстрыцы віленскім ваяводам Мікалаем Радзівілам. За кожны плыт з будаўнічага дрэва назначалася аплата ў 3 грошы, а за плыт з дроў – 12 пенязяў (у грошы было 10 пенязяў). За тавар жа, які правозіўся на плытах і чаўнах, мыта браць забаранялася [1]. Двойчы, у 1536 і 1542 гадах, віленскія мяшчане падавалі ў суд чалабітную з просьбай адмяніць мытны збор, які Мікалай Радзівіл у 1522 годзе ўвёў на кожны плыт, што праплываў па рацэ Віліі праз Быстрыцу. У 1542 годзе кароль Жыгімонт Стары сваім прывілеем вызваліў мяшчан ад уплаты мыта за прагон плытоў цераз Быстрыцу. А праз 450 гадоў мытня непадалёк ад Быстрыцы аднавілася, і сучасныя купцы зноў былі вымушаныя плаціць мыта за правоз сваіх тавараў.

У канцы XIX стагоддзя ў Быстрыцы было валаснoе праўленне, народнае вучылішча, у якім вучыліся 72 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі, прытулак, лаўка, 2 пастаялыя двары, прыёмны пакой для хворых, хлебазапасны магазін, піцейны дом… У 1938 годзе ў мястэчку пражываў 1051 жыхар. А сёння ў Быстрыцы налічваецца толькі каля 200 чалавек. Інфраструктура прадстаўлена магазінам, базавай школай, фельчарска-акушэрскім пунктам, сельскім Домам культуры, бібліятэкай. Дзейнічае касцёл Узнясення Святога Крыжа, ёсць капліца святога Яна (каля крыніцы).

Мураваны **касцёл Узвышэння Святога Крыжа** (мал. 1) у вёсцы Быстрыца быў пабудаваны на ахвяраванні парафіянаў у стылі віленскага барока ў 1760–1761 гадах. Новы напрамак позняга беларускага барока, званага віленскім, у хуткім часе распаўсюдзіўся па ўсёй краіне і, зразумела, не абмінуў рэгіён, найбольш блізкі да сталіцы. Шматлікія старажытныя святыні сталіцы Вялікага Княства Літоўскага моцна пацярпелі падчас пажараў горада ў 1737 і 1747 гадах. Іх адбудова патрабавала вялікіх намаганняў і сродкаў. У гэты час у Вільні супольна працавалі замежныя і мясцовыя архітэктары, дэкаратары, рамеснікі розных будаўнічых прафесій, якія аднаўлялі горад, надавалі яго святыням больш сучасны еўрапейскі выгляд. У выніку гэтай дзейнасці ў сярэдзіне XVIII стагоддзя тут склаўся адметны архітэктурна-мастацкі стыль, які атрымаў у мастацтвазнаўстве назву «віленскае барока» [2]. Для храмаў віленскага барока характэрныя дзве высокія шмат'ярусныя ажурныя вежы на галоўным фасадзе, якія маюць тэлескапічную будову. Ярусы вежаў паступова змяншаюцца ўверх па памерах, што надае ім моцную стэрыяскапічную перспектыву і зрокава робіць яшчэ больш высокімі і ўзнёслымі. Праёмы вежаў мелі маляўнічы фігурны абрыс, былі скразнымі, што стварала на фоне неба прыгожы карункавы ўзор, рабіла архітэктурнае збудаванне лёгкім і нібыта нематэрыяльным. Гэтую ілюзію ўзмацнялі хвалістыя абрысы планаў і фасадаў будынкаў, вытанчаны ордэрны дэкор, пышныя алтарныя кампазіцыі,якія стваралі неакрэсленыя межы паміж прасторай і масай будаўнічага матэрыялу, чым істотна адрозніваліся ад строгасці і лапідарнасці сармацкага барока папярэдняга часу.



Мал. 1. Касцёл Узвышэння Святога Крыжа, в. Быстрыца

Заснаванне ў Быстрыцы першага драўлянага касцёла адбылося ў 1523 годзе па фундацыі караля Жыгімонта I Старога [3]. У XVII стагоддзі Быстрыца лічылася мястэчкам і пазначана на карце Вялікага Княства Літоўскага 1613 года Тамаша Макоўскага як цэнтр староства. Як большасць вясковых парафіяльных святыняў, быстрыцкі касцёл Узвышэння Святога Крыжа мае даволі невялікія памеры, але вытанчанасць прапорцый, высокія стромкія вежы на галоўным фасадзе надаюць яго абліччу велічнасць і гармонію. Будынак касцёла складаецца з прамавугольнага асноўнага аб’ёма (нефа) і пяціграннай алтарнай апсіды, да якой з паўночнага боку далучана нізкая прамавугольная закрыстія. Вузкая пласціна двухвежавага галоўнага фасада-нартэкса не выступае за межы нефа, але, дзякуючы пластычнаму вырашэнню вежаў, ён выглядае яшчэ больш узнёслым. Ніжнія чацверыкі вежаў вылучаны звязкамі вытанчаных ордэрных пілястраў на руставаных п’едэсталах. Прасценкі паміж імі маюць увагнутую паверхню, у выніку чаго ўся кампазіцыя нагадвае тэатральную заслону. Два верхнія ярусы вежаў ствараюць на фоне неба ажурны сілуэт дзякуючы маляўнічым абрысам скразных праёмаў, вуглавых пілястраў, закручаных унізе ў завіткі-валюты, двух’ярусных фігурных купалкоў. Цэнтральная частка фасада, завершаная строгім атыкавым франтонам, выглядае больш манументальнай. Быстрыцкі касцёл у 1865 годзе быў прыстасаваны пад праваслаўную царкву, але ў 1918–1926 гадах вернуты католікам і рэканструяваны па першапачатковым прызначэнні.

Параўнальна з больш ранні касцёлам у Міхалішках, пры тым жа складзе аб’ёмаў (неф, пяцігранная апсіда, двухвежавы галоўны фасад), быстрыцкі касцёл мае зусім іншую стылёвую афарбоўку. Яго асноўны аб’ём унутры падзяляецца спаранымі падпружнымі аркамі не на тры, а на дзве часткі. Энергічная крапоўка сцен шырокімі пілонамі са спаранымі канеляванымі пілястрамі сваім шматпрофільным ступенчатым абрысам надае ўсяму нефу і яе часткам адвольную форму авала. У выніку атрымліваецца два авалы ў адным, якія прасторава нібы перацякаюць адзін ў адно. Скошаныя вуглы навы скіроўваюць рух прасторы да пяціграннай апсіды, якой унутры таксама нададзены авальны абрыс. Сферычная конха апсіды ў XIX стагоддзя была пакрытая арнаментальнай фрэскавай размалёўкай.

Дамінуючы ў інтэр’еры матыў авала падкрэслівае незвычайная двух’ярусная алтарная кампазіцыя, выкананая са стука карычневага колеру з пазалотай. У ніжнім ярусе прастору прэсбітэрыя ахопліваюць шырокія і гладкія, як люстра, панелі ў ракайльнай абрамоўцы, на фоне якіх выразна выглядаюць магутныя познебарочныя драўляныя скульптуры апосталаў. Ядро кампазіцыі 2-га яруса складае Распяцце, увенчанае выявай Святога Духа. Два меншыя прысценныя алтары размешчаны на вуглавых гранях асноўнага нефа і прасторава скіраваны ў бок галоўнага алтара. Над уваходам размешчаны арганныя хоры, пластычную агароджу якіх аздабляюць ракайльныя картушы.

Мястэчка спрадвеку падзяляецца на тры неафіцыйныя часткі: Башкірыю, Кутнікі і Плябанцы. Башкірыя – гэта вуліца ўздоўж Віліі. Як расказваюць мясцовыя жыхары, да вайны на ёй жылі амаль адны яўрэі. Плябанцы – гэта цэнтральная і самая галоўная частка Быстрыцы, а яе сэрца – касцёл Узнясення Святога Крыжа (мал. 2) [4].



Мал. 2. Касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца, *1871, К. Тышкевіч*

Граф Канстанцін Тышкевіч 150 гадоў таму, падчас воднага падарожжа па Віліі, пабываў у Быстрыцы і ў сваёй кнізе “Вілія і яе берагі” адзначыў, што “касцёл патрабуе значнага рамонту, асабліва звонку: паламаныя крокры пагражаюць хуткім абвалам даху; грэмсы ад вільгаці паабрываныя…”

Калі б нашчадак графа Тышкевіча прыбыў сёння ў Быстрыцу, пагглядзеўшы на цудоўны стан касцёла Узнясення Святога Крыжа, яму б заставалася толькі здзіўлена паціснуць плячыма – няўжо гэта той самы храм з паламанымі кроквамі, пра якія 150 гадоў таму пісаў ягоны продак? Ксёндз Уладзіслаў Гжэгорэк, які ўзначаліў парафію, за гады сваёй працы ў Быстрыцкім касцёле зрабіў неверагодна многа: поў-

насцю адрамантаваў храм звонку; яго намаганнямі зарослая старымі дрэвамі і хмызняком прыкасцельная тэрыторыя, якую ад дарогі аддзяляла напаўразбураная каменная агароджа, стала светлай, дагледжанай, акуратнай. Поўнасцю адноўлена агароджа, вакол касцёла з'явілася бетонная дарожка, па якой у святочныя дні ідзе працэсія. Адрамантавана плябанія і добраўпарадкавана тэрыторыя вакол яе. Праведзены рамонтныя работы ўнутры храма.

Мураваны касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў вёсцы Быстрыца з'яўляецца адным з каштоўных помнікаў позняга беларускага барока, названага віленскім.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2004. – 472 с.
2. Калаліцкія храмы на Беларусі. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2000. – С. 20.
3. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.php?option=com_content&task=view&id=111&Itemid=38.
4. Быстрыца і яе жыхары [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ostrovets.by/?p=2160.

**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА САНКТУАРЫЙ МАЦІ БОЖАЙ ШКАПЛЕРНАЙ У ГУДАГАІ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

*Даследуецца санктуарый Маці Божай шкаплернай у Гудагаі – гісторыка-культурная каштоўнасць Астравецкага раёна. Гісторыя гудагайскай парафіі цесна звязана з абразом Маці Божай. Архітэктанічна і прапарцыянальна Гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святынь позняга барока.*

На зямлі ёсць шмат месцаў, пазначаных прысутнасцю Бога, у якіх вернікі атрымліваюць шматлікія ласкі. Часам гэта незвычайнай прыгажосці катэдры і базылікі, часам – простыя драўляныя і маленькія святыні. Сярод святыняў, рассеяных па свеце, асаблівую ролю адыгрываюць марыйныя санктуарыі – месцы, звязаныя з аб'яўленнямі Маці Божай, цудоўным з'яўленнем Яе выяваў або іншымі падзеямі, якія прываблівають шматлікіх вернікаў. На Беларусі таксама даволі шмат месцаў, дзе Бог здзяйсняе вялікія справы праз пасрэдніцтва сваёй Маці. Сярод многіх абразоў Найсвяцейшай Маці важную ролю адыгрывае абраз Маці Божай Гудагайскай, звязаны са шкаплерным набажэнствам. Гэты абраз быў ўрачыста ўпрыгожаны папскімі каронамі 15 ліпеня 2007 года. Акт каранацыі цудоўнага абраза стаў чарговай важнай рэлігійнай падзеяй у жыцці Гродзенскай дыяцэзіі і ўсяго Касцёла на Беларусі [1].

Мястэчка Гудагай – цяпер невялікая вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці, на трасе Ашмяны – Астравец, недалёка ад чыгуначнай лініі Калінінград – Вільнюс – Мінск – Масква. Маляўнічыя ваколіцы – лес, узгоркі і шырока распасцёртыя стужкі-хвалі сельскагаспадарчых палёў надаюць гэтаму месцу асаблівае хараство. На ўскрайку вёскі стаіць маленькі драўляны касцёл, збудаваны на невялікім узгорку, адкуль пры добрай бачнасці відаць суседнія вёскі і горад Астравец.

Акрамя мураваных культавых збудаванняў на Астравеччыне ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства, з якіх найбольш старажытным з'яўляецца **касцёл Наведвання Божай Маці ў в. Гудагай** [2]. Касцёл фундаваны ў 1764 годзе абозным полацкім Юзафам Крыштофам Войнам з жонкай Ганнай Людвікай з Сулістроўскіх пры кляштары кармелітаў босых. Архітэктанічна і прапарцыянальна Гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святынь позняга барока. Выцягнуты прамавугольны аб'ём і роўная з ім пяцігранная апсіда прэсбітэрыя аб'яднаны двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і застрэшкамі ў месцы злучэння зрубаў. Па баках прэсбітэрыя размешчаны невысокія квадратныя ў плане сакрысціі. Галоўны фасад па вуглах асноўнага аб'ёма фланкіруюць 2 чацверыковыя вежы, якія раней завяршаліся яшчэ адным ярусам чацверыкоў з фігурнымі барочнымі купалкамі. Пасля рэканструкцыі галоўны фасад завершаны класіцыстычным трохвугольным франтонам з гарызантальнай ашалёўкай і вастраверхай сігнатуркай. У касцёле ёсць унутраны нартэкс, над якім на 2 слупах размешчаны вялікія арганныя хоры, і экзанартэкс – невысокі вонкавы прытвор-бабінец.

Паводле фотаздымка Яна Балзункевіча пачатку XX стагоддзя прытвор меў аднасхільны дашак (мал. 1). Пазней уваходны аб'ём атрымаў двухсхільны дах з трохвугольным франтонам, схілы якога адпавядаюць